**Міхась Белямук**
(Кліўленд)

## Вялікі князь Вітаўт і ягоная маестатная пячатка

У 1398 годзе князь Вітаўт вырашыў памірыцца з Крыжацкім Ордэнам. 12 жніўня на востраве Салін сабраліся прадстаўнікі Ордэна ды Вялікага Княства Літоўскага і Рускага, каб зацьвердзіць дагавор прывешаньнем пячаткаў. Пасьля гэтай цырымоніі адбыўся банкет, на якім князь Вітаўт абвясьціў, што атрымаў ліст ад польскае каралевы Ядвігі, у якім яна пісала, што Ягайла аддаў ёй Літоўскае і Рускае Княствы, як вена, таму яна мае права патрабаваць кожны год даніну. Паведаміўшы пра ліст Ядвігі, Вітаўт запытаў прысутных князёў і баяраў пра іхняю думку. Князі і баяры абурана загукалі, што даннікамі Польшчы ніколі не былі і не зычаць быць. Яны тут-жа абвясьцілі Вітаўта каралём Літвы і Русі.Такім чынам, Крэўская ўнія была анулявана[1].

Вітаўт, вярнуўшыся ў Вільню, замовіў маестатную пячатку ў італьянскіх ці французскіх скульптараў, што выразалі пячаткі каралям Казімеру Вялікаму і Ягайле[2]. Маестатная пячатка Вітаўта была дыяметрам 100 міліметраў, мела шмат падабенства да пячатак Казімера і Ягайлы. На пячатцы Вітаўт сядзіць на стольцу (троне), апрануты ў панцыр, паверх накінута раскошная мантыя, на нагах — рыцарскія пантофлі. На галаве — княжая мітра, якую ад Жыгімонта Старога пачалі зьмяшчаць на літоўскіх манетах. Гэтую мітру выдаўцы II і III Статутаў (канцлер



[1] J. Ochmański, *Historia Litwy*, Ossolineum 1967, s. 68.

[2] M. Gumowski, S. Haisig, S. Mikucki, *Sfragistyka*, Warszawa 1960, s. 132.

Мікалай Радзівіл „Руды” і Леў Сапега) зьмясьцілі на тытульнай бачыне Статутаў. У правай руцэ Вітаўт трымае скіпетр, а левай падтрымоўвае дзяржаўны герб — Пагоню. Па перыметры пячаткі легенда: „+ sigillum* allexandri* alias witowdi * magnis ducis* Lithwanie* dni Russie * et cetera”[3]. Паколькі легенда на пячатцы пашкоджаная , то яе па-рознаму чыталі.

Маестатная пячатка ў Польшчы выклікала вялікае абурэньне магнатаў, духавенства і шляхты, бо пячатка „jaskrawo podkreślała pełnię władzy monarszej”[4]. Польская канцылярыя да 1413 года тыгулавала Вітаўта толькі князем, ігнаруючы, што Вітаўт ад 1392 г., пасылаючы граматы князям і баярам у Вялілікім Княстве Літоўскім і Рускім, тытулаваў сябе „вялікім князем”[5]. Таксама ратманы горада Рыгі і магістр Ордэна тытулавалі Вітаўта „herczog” або „grosfursten”. Такую-ж тытулятуру ўжываў Вітаўт, адпісваючы ў Рыгу і магістру Ордэна[6].

Паколькі вялікі князь Вітаўт рыхтаваўся да вайны з татарскім ханам Цімурам Кутлуём, дык ён ня зычыў з-за маестатнай пячаткі ствараць канфлікт з польскім Каралеўствам. Князь Вітаўт вырашыў часова паўстрымацца і ня ўжываць пячатку. Але бітва з ханам Цімурам на рацэ Ворскле была прайграна. Армія Вітаўта разгромлена, адных князёў загінула 74 асобы, ледзь уцёк адтуль Вітаўт. Таму „dumne plany Witoldowe minęły jednego dnia, rozwiały się jak mgła za podmuchem wiatru (...). Ta kipiąca krew, porywająca go do czynu (...) postawiła niemal (...) nad przepaścią”[7].

У такой сытуацыі Вітаўт ня мог думаць пра ўжываньне маестатнай пячаткі. Тым часам, родны брат караля і вялікага князя Ягайлы князь

[3] T. Działyński, *Zbiór praw litewskich od roku 1379 do roku 1529*, Poznań 1841, pl. l, A; M. Gumowski, *Pieczęcie książąt litewskich*, „Ateneum Wileńskie”, Wilno 1930, vol. VII, s. 721.

[4] W. Semkowicz, *Sfragistyka Witolda*, „Wiadomości Numizmatyczno-Archeologiczne”, Kraków, 1931, vol.XIII, s. 83.

[5] П. Муханов, *Историческнй сборник*, Москва 1866, с. 616, № 344; *Белоруссия в эпоху феодализма*, Минск 1959, т. 1, с. 110, № 40; А. Л. Хорошкевич, *Полоцкие грамоты XIII — начало XVI вв.*, Москва 1977, т. 1, № 26; В. М. Русанівський, *Українські грамоти XV ст.*, Київ 1965, с. 13 і 35, № 8; *Codex epistolaris Vitoldi magni ducis Lithuanie 1376-1430*, Cracovie 1882, nry 107,127; *Akta unji Polski z Litwą 1385-1791*, Kraków 1932, nry 36, 40-43.

[6] А. Л. Хорошкевнч, *Полоцкие грамоты XIII — начало XVI вв.*, №№ 19-25, 31; К. Е. Наперский, *Русско-Ливонские акты*, Санкт-Петербург 1868, №№ 122, 136, 149, 196-197; *Codex epistolaris Vitoldi...* nry 117,140, 176, 179, 212, 214, 220, 253, 259, 285.

[7] A. Prochaska, *Król Władysław Jagiełło*, Kraków 1908, t. l, s. 121-122.

Свідрыгайла з дапамогаю польскае шляхты ўцёк да крыжакоў і пачаў вайну з князем Вітаўтам. Добра, што Вітаўту пашчасьціла староньнікаў Сьвідрыгайлы нейтралізаваць, а жамойцаў заахвоціць да паўстаньня супроць крыжакоў. Сьвідрыгайла зразумеў, што будзе лепш, калі ён пагодзіцца зь Вітаўтам. Узімку, на Каляды 1402/1403 года стрыечныя браты памірыліся.

Безумоўна, прайграная Вітаўтам бітва ля Ворсклы паспрыяла князю Юрыю Сьвятаславічу авалодаць Смаленскам. Вітаўт, атрымаўшы гэтае паведамленьне, вырашыў сабраць войска і вярнуць страчаны Смаленск. У пачатку красавіка 1404 г. харугвы князя Сымона-Лугвеня былі заўважаны каля Смаленска. Праз некалькі дзён падасьпелі сюды харугвы ноўгарад-северскага князя Карыбута. Але калі падышлі харугвы князя Сьвідрыгайлы і князя Аляксандра Цьвярскога, Юры Сьвятаславіч занепакоіўся. Вайсковы абруч вакол Смаленска пачаў сьціскацца. Прыблізна каля паловы травеня смаленцы загукалі, калі ўгледзелі сьцягі вялікага князя Вітаўта, воіны якога цягнулі гарматы, а гэта сьведчыла, што будзе аблога горада. Муры смаленскага замка — тоўстыя, надзейныя, але смаленскія мяшчане і частка баяраў — ненадзейныя людзі. Гэта затрывожыла князя Юрыя Сьвятаславіча, і ён употайкі выслаў пасольства да маскоўскага князя Васіля Дзьмітравіча, просячы, каб той заступіўся, каб ён, як зяць Вітаўта, стаў пасрэднікам у заключэньні міру зь Вітаўтам. Але маскоўскія дыпляматы не сьпяшылі з адказам Юрыю Сьвятаславічу. Яны разважалі, што ягоная сытуацыя — крытычная, таму чакалі, што князь Юры Сьвятаславіч зробіць новыя прапановы, больш выгадныя. І сапраўды, князь Юры, бачачы сваё безнадзейнае становішча, вырашыў паехаць да маскоўскага князя Васіля Дзьмітравіча, прасіць дапамогі.

Тым часам на сёмым тыдні аблогі горада князь Вітаўт атрымаў грамату ад віленскага старасты Монвіда. У грамаце пісалася, што польскія пралаты, магнаты і шляхта ў Рацёнжы дамовіліся з прадстаўнікамі Ордэна, што Жамойць аддаецца крыжакам і жамойцы павінны спыніць антыкрыжацкае паўстаньне. У выпадку, калі-б тыя не паслухаліся, дык Вітаўту загадвалася спыніць дастаўку солі, збожжа, металу, зброі. Таксама Вітаўту забаранялася даваць прытулак уцекачам з жамойцкае зямлі і не аказваць ім дапамогі, а жыхарам Вялікага Княства Літоўскага і Рускага забаранялася кантактавацца з жыхарамі Жамойці. Князь Вітаўт абавязаны быў загадаць жамойцам скласьці прысягу Крыжацкаму Ордэну і даць яму адпаведную колькасьць закладнікаў. У выпадку, калі-б жамойцы адмовіліся ад прысягі і супрацівіліся даць закладнікаў, тады князь Вітаўт мае права ўжыць вайсковую сілу. Кожную просьбу магістра Вітаўт абавязаны выканаць, у іншым выпадку Крыжацкі Ордэн мае права прымусіць Вітаўта да паслушэнства, і на

польскую дапамогу той ня можа разлічваць[8].

Атрымаўшы такое „пасланьне” польскіх пралатаў, магнатаў і шляхты, Вітаўт склікаў прысутных князёў і баяраў на нараду. Адчытаўшы атрыманае „пасланьне”, запытаў: „Што маем рабіць са Смаленскам?” Усе асьведчылі, што трэба сьпяшыць ратаваць Троцкае Княства, бо крыжакі пад розным повадам напэўна ўдараць на Горадню, Наваградак і Трокі, таму аблогу Смаленска прыйдзецца зьняць.

На наступны дзень сьціхлі гарматы, але князь Юры Сьвятаславіч ня ведаў прычыны, таму ён рашыўся сказаць маскоўскаму князю Васілю Дзьмітравічу ў прысутнасьці маскоўскіх саноўнікаў: „Возми убо градъ за себя, да ты владеешь имъ, а не погана Литва”[9]. І тут-жа аслабелы асунуўся на падлогу, але кніжнік з Усцюга пасьпеў запісаць: „Запиши себе Смоленск во вотчину, яз тебе служу”[10].

Гэтак Смаленскае Княства, паводле тагачасных праўнікаў, сталася законнай уласнасьцю маскоўскага князя. Маскоўскае баярства патрабавала чым хутчэй пасlаць туды пісцоў, каб прывесьці смаленцаў да прысягі маскоўскаму князю. Тым часам смаленцы ўгледзелі, што гарматы адцягаюць і пешыя вoі пакідаюць свае пазыцыі, а гэта сьведчыла, што аблога горада спыняецца і князь Юры Сьвятаславіч можа вярнуцца ў Смаленск. Пачалася вечавая гамонка. Вялікая частка смаленцаў была абурана дзейнасьцю князя Юрыя Сьвятаславіча, які аддаў Смаленскае Княства маскоўскаму князю Васілю Дзьмітравічу, і патрабавала паслаць пасольства да вялікага князя Вітаўта і прасіць яго вярнуцца. „Поспеши скоро прийти къ намъ, и отворимъ ти градъ, понеже вси хотимъ и любимъ тебя”[11].

Вітаўт, выслухаўшы смаленскіх пасланцоў, загадаў лёгкаўзброеным конным харугвам спыніцца ды павярнуць на Смаленск. Смаленцы, угледзеўшы паварот Вітаўта, ударылі ў званы й адчынілі гарадзкія вароты, каб харугвы Вітаўта змаглі свабодна ўехаць у горад. Так трыумфальна вялікі князь Вітаўт 24 чэрвеня 1404 года ўехаў у стары крывіцкі горад і абвясьціў: „Градъ держати по его велению, а людем Смоленскимъ лготу многу чинити (...) чтобы Витовта вся земля Смоленская и хотела и любила”[12].

Вяртаньне Смаленска было першым посьпехам Вітаўта пасьля кры-

[8] J. Daniłowicz, *Skarbiec dyplomatów papieskich, cesarskich, królewskich, książęcych, znajdujących się w bibliotece Muzeum Wileńskiego*, Wilno 1860, s. 343, nr 795.

[9] *Патриаршая или Никоновская летопись*, [в:] *Полное собрание русских летописей*, Москва 1965, т. XI-XII, с. 189.

[10] *Устюжский летописный свод*, Москва 1950, с. 69.

[11] *Патриаршая или Никоновская летопись*, с. 190.

[12] Там жа.

вавай бітвы на рацэ Ворскле. Для Вітаўта гэта быў трыумф, але для Юрыя Сьвятаславіча — трагэдыя. Маскоўскі князь зьвінаваціў князя Юрыя, кажучы: „приехал ты до мене со хитростию, желаючы, чтобы смоляне здалися Витовту и возложи нелюбие, и князь Юрый пабежа съ Москвы в Великий Новгород”[13].

Вітаўт, вярнуўшыся ў Вільню, аднавіў перамовы з крыжакамі, з магістрам Канрадам. У Коўне былі выдадзены тры граматы ад 17 жніўня 1404 г., у якіх Вітаўт запэўніваў крыжакоў, што пастановы, прынятыя ў Рацёнжы, ён выканае. У гэтых граматах, у карпарацыйнай частцы, гаварылася, што Вітаўт прывесіць найбольпую сваю пячатку „unserm groesten ingezegil, а гэта значыць — маестатную. Маестатная пячатка была найбольшай пячаткаю, бо мела дыяметр 100 міліметраў. І сапраўды да грамат ад 17 жніўня 1404 года прывешана маестатныя пячатка вялікага князя Вітаўта, выціснутая ў чырвоным воску[14]. Зрабіў гэта Вітаўт, помсьцячы за „пасланьне” польскім пралатам, магнатам і шляхце, за іхнюю вераломную пастанову ў Рацёнжы, якую прывёз яму ганец віленскага старасты Монвіда пад Смаленск.

[13] *Устюжский летописный свод*, с. 69.

[14] *Codex epistolaris Vitoldi magni ducis Lithuanie 1376-1430*, nгу 295-297.